# З узаемнай **цеплынёй**

## АНСАМБЛЮ КАФЕДРЫ ХАРЭАГРАФІІ УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ — 25 ГАДОЎ

**Юлія Чурко**

**У якасці своеасаблівай прадмовы. Нялёгка было мне, загадчыцы кафедры харэаграфіі, аказацца падначаленай у сваёй былой студэнткі. У выніку розных турбацый, у тым ліку і навучальных планаў, я пачала чытаць эстэтыку на кафедры філасофіі. Але яна, на жаль, як прыйшла, так і пайшла — зноў выпала з навучальных планаў. (І вельмі шкада: эстэтыка шмат дала мне, магла б не менш даць і студэнтам.) Давялося вярнуцца на сваю ранейшую кафедру, праўда, маючы цікавую прапанову — выкладаць гісторыю харэаграфіі. У якасці маёй начальніцы Святлана Вячаславаўна (так цяпер трэба было яе называць) аказалася разумнай, далікатнай, велікадушнай і такой, якая ўсё разумее.**

1. «Спрытныя ў працы».
2. Фальклорная вечарына ў Строчыцах.
3. «Вясна на фронце».
4. «Шлях у Валхалу».
5. «У хвалях гранітнага мора».
6. «Ад першай сцяжынкі».
7. «Тры "В"». На конкурсе IFMC.

*Фота з архіваў Ансамбля кафедры харэаграфіі.*



1.

Ну а цяпер уласна пра ансамбль кафедры харэаграфіі Універсітэта культуры і мастацтваў (БДУКіМ) і яго кіраўніцу Святлану Гуткоўскую.

Адной з найбольш цікавых з'яў у сучасным харэаграфічным мастацтве нашай краіны можна лічыць нараджэнне і паспяховае існаванне студэнцкіх калектываў. Вось яркі і добра вядомы прыклад: Ансамбль кафедры харэаграфіі Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Ён існуе з 1995 года і за чвэрць стагоддзя падрыхтаваў 23 арыгінальныя канцэртныя праграмы (каля 300 харэаграфічных кампазіцый), якія былі паказаныя на лепшых пляцоўках краіны. Натуральна, гэта сведчыць пра інтэнсіўную творчую дзейнасць і зацікаўленасць усіх удзельнікаў калектыву.

Заснавальніца і нязменная мастацкая кіраўніца ансамбля — Святлана Гуткоўская, цяпер прафесарка і загадчыца кафедры харэаграфіі БДУКіМ. Яна атрымала прафесійную адукацыю ў Беларусі, вывучала народны і сучасны танец у многіх краінах — ад Еўропы да Амерыкі — і працягвае стажыравацца ў вядучых харэаграфічных цэнтрах свету.

Яе погляды на мастацтва танца складаюць аснову мастацкай і, чытай, ідэалагічнай платформы калектыву. Трэба сказаць, што ансамбль заваяваў сабе трывалую творчую рэпутацыю. Студэнты, яго ўдзельнікі, выступаюць адразу ў дзвюх якасцях: як пастаноўшчыкі і як выканаўцы канцэртных нумароў, бо часцей за ўсё вучацца ў адной акадэмічнай групе. Гэта дазваляе яднаць навучальныя задачы з паказам пастановак на сцэне і робіць ансамбль правобразам або, калі заўгодна, мадэллю менавіта такога мастацкага арганізма, у якім будучым спецыялістам-харэографам трэба будзе працаваць у розных ролях пасля заканчэння ВНУ.

Спадарыня Святлана перакананая, што вялікая адказнасць узнікае дзякуючы выхаду на шырокую аўдыторыю і ў выканаўцы, і ў пастаноўшчыка, гэта фармуе маладога спецыяліста і выхоўвае ў ім разуменне сутнасці прафесіі. У хлопцаў і дзяўчат ёсць магчымасць паказваць свае нумары: хай яшчэ і недасканалыя, але шчырыя, сумленныя, якія раскрываюць іх творчыя пазіцыі.

Прэзентацыя народнага танца, убачанага вачыма сённяшняга чалавека, — менавіта такая пазіцыя калектыву ў дачыненні да фальклору вызначыла сучасныя рытмы і ракурсы сцэнічных кампазі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цый. Яркімі і каларытнымі атрымаліся многія фальклорныя вечарыны. Назаву некаторыя з іх: «Ля крыніцы», «Вяселлейка», «Танчым па-даўнейшаму», «Каму пашанцуе, той і станцуе», «А калі што якое, дык што тут такое», «Да свайго роду, хоць праз ваду!», а таксама тэматычныя праграмы па матывах народнай танцавальнай творчасці беларусаў: «Сезоны: знаёмае і таямнічае», «Ад зямлі да зор і сонца». Думаю, яны прынеслі задавальненне ўсім — гледачам, кіраўніцтву ўніверсітэта, удзельнікам.
Маладых балетмайстраў турбуе праўдзівасць, дакладнасць сцэнічнага прачытання фальклорных вобразаў, стымулюе імкненне да глыбокай і шматбаковай яе інтэрпрэтацыі. Бо народны танец, арыентаваны толькі на святочныя імпрэзы, не можа выказаць па-сапраўднаму ўсю паўнату чалавечага быцця. Яго мову можна выкарыстоўваць як сродак драматургічнага адлюстравання грамадскіх і асабістых канфліктаў, стварэння жывых чалавечых характараў.
Такім чынам, адбываецца пераадоленне жанравай абмежаванасці ў сцэнічным асэнсаванні народнага танца. У калектыве не займаюцца проста пераносам фальклору на сцэну: створаныя харэаграфічныя кампазіцыі ўяўляюць з сябе адлюстраванне асабістага бачання пастаноўшчыкаў мінулага і сучаснасці сваёй Радзімы. І не выпадкова грунтам асобных нумароў зяўляюцца народныя абрады, легенды, казкі, што зрабіліся трывалай асновай, па якой пастаноўшчыкі «вышываюць» свае ўласныя пластычныя малюнкі. Вынаходлівая фантазія балетмайстраў-пачаткоўцаў сведчыць і пра паэтычнае ўспрыманне ўзораў народнай творчасці і пра імкненне захаваць іх самабытнае нацыянальнае аблічча падчас сцэнічнага ўвасаблення.

У рэпертуары ансамбля прысутнічаюць нумары розных стыляў і відаў харэаграфічнай вобразнасці. Выступленні калектыву — заўсёды ўражлівае відовішча. Энтузіязм маладых выканаўцаў перадаецца гледачам, якія запаўняюць залы, дзе ансамбль дае свае канцэрты. Аўдыторыя збіраецца самая розная. Маладым артыстам апладзіравалі на фальклорных форумах у Іспаніі, Партугаліі, Германіі, Латвіі, на фестывалях сучаснай харэаграфіі ў Польшчы, Расіі, княстве Манака.
Адна немалаважная акалічнасць вызначае сур'ёзны выканальніцкі ўзровень: усе ўдзельнікі добра валодаюць школамі класічнага і народна-сцэнічнага танца, беражліва ставяцца да іх і вераць у іх выразныя магчымасці. Захоўваючы вернасць танцавальнаму фальклору, студэнты ствараюць харэаграфічныя кампазіцыі, умела выкарыстоўваючы яго вобразную сілу.
З першых дзён свайго існавання ансамбль, вырашаючы першачарговую задачу — прапагандаваць беларускі танец, — імкнуўся ў сваіх пошуках да новых харэаграфічных форм і мастацкіх рашэнняў. Святлана Гуткоўская прыцягвае для пастаноўкі тых, хто валодае рознымі сістэмамі сучаснай харэаграфіі, пасляхова супрацоўнічае з кампазітарамі, мастакамі і музыкантамі-інструменталістамі. Творчасць калектыву адрозніваецца ад іншых тым, што ставарае на дзіва гарманічны сінтэз прыёмаў і вобразных сістэм шматлікіх напрамкаў, якія існуюць сёння ў танцавальнай пластыцы.
Народна-сцэнічны танец, зяўляючыся асновай, не дамінуе, а як быццам акумулюе, збірае ў сабе лексіку іншых відаў харэаграфічнага мастацтва і трансфармуе яе. Стваральнікаў рэпертуару ў сцэнічным увасабленні народных звычаяў хвалюе праблема стылістычнай і эмацыйнай шматколернасці абрадаў і рытуалаў.
Балетмайстарскія працы студэнтаў, створаныя пад кіраўніцтвам педагога на дысцыпліне «Мастацтва балетмайстра», пераважаюць у рэпертуары, але запрашаюцца і харэографы збоку, у тым ліку і з-за мяжы (ЗША, Польшча, Францыя).
Аднак для разумення атмасферы, якая існуе ў калектыве, варта ведаць, што Святлана Гуткоўская дае магчымасць ставіць выпускнікам кафедры — былым удзельнікам ансамбля, бо верыць у іх талент і спрыяе іх прафесійнаму станаўленню. Нядзіўна, што яе першым памочнікам у якасці балетмайстра-рэпетытара і пастаноўшчыка многіх канцэртных нумароў апошнія восем гадоў выступае Павел Стрэльчанка, былы саліст калектыву, а цяпер калега.
З самага пачатку ў ансамблі існавала выразная эстэтычная платформа. Маладое пакаленне заўсёды хоча эксперыментаваць, ламаць старыя, звыклыя каноны, рабіць творы сінтэтычнага характару, адкрываць новыя далягляды, таму і ажыццёўлены пастаноўкі з разнастайнымі сюжэтамі, дыяпазон якіх вельмі шырокі. У асобных нумарах на першы план выходзіць пошук шляхоў псіхалагічнага паглыблення ў вобраз («Я-кавасць», «Сам-насам з надзеяй», «Зачараванне даўніной», «Загадкавы лес», «Калыхай-ка»); пошук новых форм прыгажосці ў звычайных рухах («Галубка», «Пяшчотны вальс»); ёсць тыя, што прасякнуты энергічнасцю, атлетызмам, тэхнічна складанымі трукамі («Карабель плыве», «Шлях у Валхалу», «Бо я — мужык»), ёсць прасякнутыя весялосцю і жартамі («СамоварЧик», «Біць шаміля», «Гаспадарка-клапатарка», «Аркестрык»). Думаю, яны запомніліся не толькі мне. Нумары, вырашаныя сродкамі сучаснага танца, аб'ядноў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вае імкненне да паглыбленага спасціжэння ўнутранай сутнасці чалавека нашых дзён.
З такіх аўтарскіх харэаграфічных кампазіцый былі складзеныя цэлыя канцэртныя праграмы: «Новы танец», «Танец і сучаснасць», «Сучасная танцавальнасць», «Стоп, знята!».
Студэнты-пастаноўшчыкі і сёння шмат эксперыментуюць з музычным матэрыялам: ахвотна выкарыстоўваюць сапраўдную народную музыку, але манціруюць яе адпаведна задуме, дамаўляюцца з кампазітарамі-пачаткоўцамі, сочаць за рэпертуарам сучасных музычных гуртоў. Такім чынам, гледачы атрымліваюць магчымасць пачуць выдатную музыку беларускіх кампазітараў і ўбачыць яе інтэрпрэтацыю ў танцы.
Сведчу: яны вартыя адно аднаго! Наогул музыка — як інтэлектуальная і эмацыйная аснова харэаграфічнай кампазіцыі — з'яўляецца важным складнікам поспеху калектыву. Пры выбары музычнага твора для харэаграфічнага ўвасаблення перад маладымі балетмайстрамі заўсёды ставілася высокая планка. У гэтым вялікая заслуга музычнай кіраўніцы калектыву Алены Ільіной.
У прыярытэце заўсёды была, як яна кажа, «нацыянальная скарбніца» — гэта значыць народная музыка ў самых разнастайных апрацоўках, аранжыроўках, аркестроўцы і стылізацыі, а таксама сачыненні беларускіх кампазітараў і з рэпертуару розных гуртоў.
У апошні час перавага аддавалася калектывам невядомым ці малавядомым ў харэаграфічных колах. Такі падыход да выбару музычнай асновы даў плённыя вынікі. Так, Ансамбль кафедры харэаграфіі першым пазнаёміў шырокую публіку з харэаграфіяй на музыку з рэпертуару сучасных беларускіх гуртоў Pawa («Ад першай сцяжынкі»), Osimira («Лазавік»), NHS («Гарэза-каза»), Dzivia («Бо я — мужык»), Irdorath («Карабель плыве»), Shaman Jungle («У хвалях гранітнага мора»), Lity Taler («Пляценне брэдзеня»).
Пошук нечаканых музычна-танцавальных рашэнняў прывёў да з'яўлення ў рэпертуары ансамбля кампазіцый на музыку з праекту «Нежное Это» («Вучэбка»), замежных ансамбляў Adiemus («Пустынны вецер самум»), Metamorphosis («А дзе нота?»), Aiborada Peru («Акрыленыя ветрам»).
На музыку Алесандра Марчэла народны артыст Беларусі Уладзімір Іваноў паставіў кампазіцыю «Давай успомнім», якая доўгія гады цешыла і натхняла ўдзельнікаў ансамбля і, вядома, гледачоў. З выдатнай музыкай Антоніа Вівальдзі ў беларускіх студэнтаў-харэографаў узнікла ўзаемапаразуменне дзякуючы амерыканскай балетмайстарцы: Нета Пульвермахер паставіла для іх нумар «Вівальдзіяна».
Цёплы водгук ва ўсіх сэрцах знайшла і музыка беларускіх кампазітараў Паўла Клышэўскага («І плакала неба»), Аляксея Сілаева («Шлях у Валхалу»), Уладзіміра Кандрусевіча («Белая ластаўка»), Ігара Мангушава («Наш дом»).
Экзатычнай нетутэйшасцю вылучаецца сачыненне сучаснага кітайскага кампазітара Лю Сяопіна («Добрыя весткі ад сарокі»), маляўнічасцю і яркай энергетыкай — твор нямецкага кампазітара Клаўса Бадэльта («Экзерсісы»), нязвыклым гукавым рашэннем — опус расійскага калектыву ЛНЭМ («Без шанцу на жыццё»), сучаснасцю і эксперыментальнасцю — творчасць музыкаў з Санкт-Пецярбурга «Сказы лесу» («Спрытныя ў працы»). З задавальненнем канстатую, што ўсе яны знайшлі свае цікавыя харэаграфічныя рашэнні.
І ўсё ж дыхтоўна аранжыраваная народная музыка Беларусі заўсёды з'яўлялася асновай харэаграфічнага рэпертуару Ансамбля кафедры і была ў прыярытэце. Гэта творы ў выкананні аркестраў Нацыянальнага акадэмічнага аркестра імя Жыновіча («Коварат наадварот», «Калядныя забавы»), Беларускага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» («Карапет»), ансамбля «Белыя Росы» («Палеская кадрыля»), калектыву «Крупіцкія музыкі» («Чырачка»,«Вальсочак»); ансамбляў народнай музыкі «Бяседа» («Кадрыльная», «Круцёлка»), «Траецкія музыкі» («Па яблыкі»), «Паазер'е» («Майстрыха»), «Беларускі гасцінец» (полька «Канарык»). Прашу прабачэння за доўгі пералік, але, паверце, ён таго варты.
Значнае месца ў арсенале ансамбля займае творчасць вядучых беларускіх музычных калектываў, якія працуюць у стылях фольк і сярэднявечнай беларускай музыкі. Тут варта адзначыць этна-трыа «Троіца» («Зачараваная даўніной»), групы «Krīwi» («Каза», «Ай, да поездочка!»), «Стары Ольса» («Стальмахі»).
Большасць канцэртных праграм складаецца з асобных мініяцюр. Аднак, нягледзячы на відавочную, на першы погляд, дробную «раскадроўку» прадстаўлення, усе яго нумары арганічна ўзаемазвязаны драматургіяй. Шырока выкарыстоўваючы прыёмы сучаснай пластыкі, узбагачаючы арсенал выразных сродкаў харэаграфічнымі фарбамі, у тым ліку і запазычанымі з палітры розных танцавальных напрамкаў, Святлана Гуткоўская, выступаючы ў ролі рэжысёркі, імкнецца да такой кантыленнасці ўсяго дзейства, пры якой адна харэаграфічная гісторыя як бы «перацякае» ў іншую.
Эмацыйную танальнасць сцэнічных твораў і асаблівую манеру харэаграфічных «выказванняў» аўтараў нумароў, што ўваходзяць у рэпертуар студэнцкага калектыву, адчула не адна я. Яе арганічна перадаў у касцюмах вядомы беларускі мастак Юрый Піскун, які на працягу многіх гадоў супрацоўнічае са студэнцкім калектывам. Творчая дружба пачалася з фестывалю «Сожскі карагод», дзе ён з'яўляўся сябрам журы. У Гомелі, у конкурснай праграме ансамбль паказаў нумар «Ланцуг», што атрымаў II прэмію ў намінацыі «Балетмайстарская праца». Уражаны свежасцю харэаграфічнага рашэння старадаўняга беларускага танцавальнага ўзору, Юрый Аляксандравіч прапанаваў намаляваць эскізы касцюмаў, якія б падкрэслівалі мастацкія вартасці нумара. Галаўныя ўборы, спадніцы, кашулі, фартухі, паясы — інакш кажучы, усе складнікі сцэнічнага касцюма кожнай пастаноўкі ў яго рашэнні знаходзяцца ў дзіўнай гармоніі са стылістыкай і вобразнай сістэмай харэаграфічнай кампазіцыі.
Ансамбль, як часта здараецца, — гэта калектыў аднадумцаў. А ў дадзеным выпадку заўважу, што ўсіх удзельнікаў аб'ядноўвае агульнасць ідэйнамастацкіх памкненняў. Традыцыі, закладзеныя на пачатку яго дзейнасці, знаходзяць працяг і перыядычна абнаўляюцца, але не губляюць эстэтычных якасцей. Калектыў захоўвае лепшыя нумары ў сваім рэпертуары. Балетмайстры-пачаткоўцы маюць выдатныя прыклады творчасці, магчымасць для доследаў і эксперыментаў. Акрамя таго (я зноў-такі была сведкай), яны заўсёды адчуваюць гарачую зацікаўленасць і падтрымку аднакурснікаў, што стварае спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення задум.
Сёння Ансамбль кафедры харэаграфіі БДУКіМ уваходзіць у лік лепшых харэаграфічных калектываў краіны, з'яўляецца лаўрэатам прэстыжных міжнародных конкурсаў (пра гэта пераканаўча сведчаць дыпломы на сценах кабінета загадчыцы кафедры). Гэта Міжнародны харэаграфічны конкурс «Рыжская вясна» (Латвія), Міжнародны конкурс сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (IFMC), Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Гомель), Міжнародны фестываль-конкурс сольнага танца імя Махмуда Эсамбаева (Грозны, Чачэнская Рэспубліка). Калектыў двойчы адзначаны Гран-прэміяй і чатыры разы — заахвочвальнай прэміяй Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Усім гэтым можна ганарыцца. Што раблю і я, маючы да вышэй пералічанага апасродкаванае дачыненне. Стракаты калейдаскоп канцэртаў, праектаў, прадстаўленняў, ажыццёўленых на працягу 25 гадоў студэнцкім ансамблем, утварыў маштабную панараму, якая нібы ўвабрала ў сябе яркія з'явы сучаснай харэаграфічнай культуры. Усёй шматграннай творчай дзейнасцю калектыў зрабіў значны і варты ўвагі ўнёсак у развіццё нацыянальнага мастацтва.
І напрыканцы. Як вядома, без цяпла і святла не ўзнікне ніякая перамога. Толькі атачыўшы харэографа-пачаткоўца ўвагай і клопатам, можна чакаць ад яго адпаведных вынікаў, — так можна сфармуляваць крэда мастацкага кіраўніка ансамбля. І Святлана Гуткоўская з'яўляецца менавіта такой. Яна па-мацярынску цёпла ставіцца да сваіх падапечных і з'яўляецца не толькі іх настаўніцай і кіраўніцай, але і сябрам. Студэнты гэта адчуваюць і плацяць ёй не толькі павагай, але і даверам. І, як мне падалося падчас працяглага назірання, сустрэчным цяплом. Ⓜ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


2.


5.


3.


6.


4.


7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ